УДК [37.016:82]:376

# КАРЭКЦЫЙНА-РАЗВІЦЦЁВАЯ РАБОТА З ЛІТАРАТУРНЫМ ТЭКСТАМ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ЎМЕННЯЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў НАВУЧЭНЦАЎ З ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ НЕДАСТАТКОВАСЦЮ

**І. А. Свірыдовіч,**
*кандыдат педагагічных. навук,* дацэнт;
**Л. А. Сямёнава-Ёрш**

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца асаблівасці фарміравання ўменняў навучальнай дзейнасці ў вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю сродкамі літаратурнага тэксту. Вызначаны напрамкі і ўмовы карэкцыйна-развіваючай работы. Дасягненне пастаўленых мэт непарыўна звязана з карэкцыйнай працай, якая ажыццяўляецца праз індывідуалізацыю і дыферэнцыяцыю працэсу навучання.

**Ключавыя словы:** інтэлектуальная недастатковасць; вучэбная дзейнасць; літаратурны тэкст.

# CORRECTIONAL AND DEVELOPMENTAL WORK WITH A LITERARY TEXT AS A MEANS OF DEVELOPING THE SKILLS OF EDUCATIONAL ACTIVITY IN STUDENTS WITH INTELLECTUAL DISABILITIES

**I. Svirydovich,**
*PhD in Pedagogy, Associate Professor;*
**L. Siamionava-Yorsh**

**Abstract.** Features of learning activity skills formation in students with intellectual disabilities by means of a literary text are considered in the article. The directions and conditions of correctional and developmental work are determined. Achieving the goals set is inextricably linked with the correctional work carried out through the individualization and differentiation of the learning process.

**Keywords:** intellectual disability; educational activity; literary text.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі у якасці адной з мэт спецыяльнай адукацыі вызначае сацыяльную адаптацыю і інтэграцыю ў грамадства асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Да ліку галоўных складаючых жыццёвай кампетэнцыі навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю адносяцца ўменні вучэбнай дзейнасці, у прыватнасці, чытацкай. Асаблівае значэнне пры гэтым набываюць пытанні ўдасканалення метадаў работы з кнігай, павышэння самастойнай дзейнасці дзяцей, навучанне рацыянальным прыёмам работы з літаратурнымі тэкстамі (А. К. Аксёнава, В. Я. Васілеўская, С. Ю. Ільіна і інш.).

Ад таго, наколькі глыбока і поўна засвойваюць навучэнцы з інтэлектуальнай недастатковасцю матэрыялы тэкстаў кніг, умеюць у іх арыентавацца, шмат у чым залежыць эфектыўнасць адукацыйнага працэсу ў дапаможных школах, класах інтэграванага навучання і выхавання, а таксама інклюзіўнай адукацыі.

Найбольш сензітыўным для мэтанакіраванага фарміравання ўменняў вучэбнай дзейнасці з'яўляецца малодшы школьны ўзрост. Намаганні педагогаў пры гэтым канцэнтруюцца перш за ўсё на фарміраванні спосабаў здабывання новай інфармацыі. Найбольш актуальнымі крыніцамі інфармацыі для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю з'яўляюцца тэксты, рэальныя аб'екты і іх выявы, дзеянні (практычныя і інтэлектуальныя). У працэсе работы з тэкстам як сродкам інфармацыі фарміруюцца ўменні актыўнага слухання, расказвання, работы з друкаваным тэкстам. Уменне прадуктыўна працаваць з кнігай і падручнікам дапаможа навучэнцам лепш авалодаць ведамі, павысіць агульную культуру. Для фарміравання гэтых уменняў важна выкарыстоўваць магчымасці не толькі навучальных, але і карэкцыйных заняткаў.

Цяжкасці, якія адчуваюць навучэнцы з інтэлектуальнай недастатковасцю падчас авалодання вучэбнай праграмай, абумоўлены цэлым шэрагам недахопаў іх пазнавальнай дзейнасці. Даследчыкі адзначаюць нізкі ўзровень іх пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці, павярхоўнасць мыслення, слабасць маўленчай рэгуляцыі, зніжэнне тэмпу і рухомасці псіхічных працэсаў, у прыватнасці, прыёму і перапрацоўкі інфармацыі, абмежаваны запас ведаў і ўяўленняў пра навакольны свет.

Навучэнцы малодшых класаў з лёгкай інтэлектуальнай недастатковасцю знаходзяцца на нізкім узроўні ўсведамлення ўнутранай логікі разгортвання зместу тэксту. Складаная іерархія структурных сувязей паведамлення не заўсёды ўсведамляецца імі. У працэсе чытання навучэнцы дапускаюць вялікую колькасць памылак, якія ўскладняюць разуменне сэнсу прачытанага і тармозяць развіццё тэхнікі чытання. Пры пераказванні зместу тэксту дзеці перадаюць яго няпоўна, з вялікай колькасцю скажэнняў асобных сэнсавых і лагічных сувязей (В. Р. Пятрова, У. І. Лубоўскі, Ж. І. Шыф і інш.). Настаўніку неабходна дакладна ўяўляць асноўныя прычыны і механізмы гэтых цяжкасцей у кожнага дзіцяці і на падставе гэтага выкарыстоўваць адпаведныя прыёмы карэкцыйна-развіццёвай работы як на ўроку, так і на карэкцыйных занятках па развіцці пазнавальнай дзейнасці.

Карэкцыйна-развіццёвая работа з тэкстам прадугледжвае яго ўсвядомленае ўспрыманне праз разуменне задумы аўтара, мастацкіх сродкаў і асэнсаванне свайго ўласнага стаўлення да прачытанага. Яна накіравана на найбольш поўнае разуменне інфармацыйнага, сэнсавага і ідэйнага бакоў тэксту.

Работа з літаратурным тэкстам уключае ў сябе наступную сукупнасць уменняў вучэбнай дзейнасці: вызначэнне мэты чытання; прагназаванне зместу тэксту (па загалоўку, ілюстрацыям); адказы і пастаноўка пытанняў па змесце тэксту; знаходжанне і тлумачэнне значэнняў новых слоў; падзел тэксту на лагічна завершаныя часткі (складанне плана); выкарыстанне ілюстрацыйнага матэрыялу для больш глыбокага разумення зместу тэксту; вылучэнне галоўнай думкі; пераказ зместу тэксту; выказванне свайго стаўлення да прачытанага;

ацэнка ўчынкаў герояў і інш. Авалоданне дадзенымі ўменнямі забяспечвае развіццё гаворкі, мыслення, эмацыйна-валявых і маральных якасцей асобы.

Змест карэкцыйна-развіццёвага навучання ў працэсе работы з тэкстам звязаны з мэтанакіраваным фарміраваннем у навучэнцаў пазнавальных інтарэсаў і асноўных агульнанавучальных уменняў (разумець інструкцыі, арыентавацца ў заданні, планаваць свае дзеянні, даводзіць выкананне задання да канца, выяўляць незразумелае, шукаць патрэбную інфармацыю, ажыццяўляць самакантроль, выпраўляць дапушчаныя памылкі) [2; 3]. Асаблівасць зместу навучання пры гэтым заключаецца ў тым, што фарміраванне ўменняў вучэбнай дзейнасці ажыццяўляецца не толькі на карэкцыйных занятках, уроках беларускай мовы і чытання, але і на ўсіх іншых прадметах вучэбнага плана.

Для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю характэрна нізкая навучальная матывацыя. У многіх з іх не ўзнікае патрэбнасць навучыцца чытаць, пазнаваць новае і інш. У сувязі з гэтым узмацняецца роля настаўніка як матыватара вучэбнай дзейнасці дзяцей. Пры рабоце з тэкстам гэты аспект рэалізуецца перш за ўсё праз сітуацыю прымянення, стварэння камунікатыўнай атмасферы. Развіццю цікавасці да чытання могуць садзейнічаць наступныя прыёмы: прызнанне настаўнікам дасягненняў дзіцяці; прымяненне гульнёвых і разнастайных займальных прыёмаў навучання, нагляднасці, дыдактычных гульняў; арганізацыя і апора на асабісты вопыт дзяцей, выкарыстанне аналогій з жыццёвымі сітуацыямі; падбор заданняў, якія адпавядаюць магчымасцям дзяцей, і аказанне неабходнай для іх выканання дапамогі і інш.

Карэкцыйна-развіццёвае навучанне заключаецца ў стварэнні ўмоў для работы з літаратурным творам у такім выглядзе, каб яго аналіз актывізаваў працэс зносін дзяцей, развіваў уменні задаваць пытанні па тэксце, які аналізуецца, слухаць і разумець адказы іншых навучэнцаў, аргументаваць свой пункт гледжання, правільна будаваць выказванне, карэкціраваць сябе ў выпадку няправільнага адказу [1; 4]. У навучэнцаў таксама фарміруецца ўменне аналізаваць розныя мадэлі паводзін на аснове тэксту, ілюстрацый або сітуацый, якія мелі месца ў жыццёвым вопыце дзяцей, праблемных сітуацый. Работа над пераказам спрыяе фарміраванню і ўдасканаленню ўмення паслядоўна ўспрымаць і ўзнаўляць важныя сэнсавыя часткі, усталёўваць сувязь паміж імі, бачыць дынаміку падзей і эмоцый герояў, ацэньваць іх учынкі.

Арганізацыя і методыка карэкцыйна-развіццёвай работы па развіцці ўменняў чытацкай дзейнасці ў навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю павінна быць накіравана на стварэнне ўмоў для пераносу сфарміраваных уменняў у новыя сітуацыі. У сувязі з гэтым вялікае значэнне набывае агульнасць зместу карэкцыйна-педагагічнай работы на карэкцыйных занятках і ўроках, што ў той жа час не азначае іх дубліраванне. Гаворка ідзе пра такое ўзгадненне зместу навучання дзяцей, якое будзе садзейнічаць выкарыстанню ўменняў, якія фарміруюцца ў іх у новых умовах [2; 3].

Асаблівае месца ў карэкцыйна-развіццёвай рабоце павінна адводзіцца фарміраванню ў навучэнцаў умення працаваць з ілюстрацыямі да тэкстаў. Гэта звязана з тым, што на ўроках па розных прадметах вучні ўвесь час сустракаюцца з імі. Сюжэтны малюнак, які ілюструе тэкст, дапамагае навучэнцам уявіць тую

ці іншую дзеючую асобу, аб'ект, пра які ідзе гаворка, усталяваць узаемасувязь паміж героямі, вызначыць паслядоўнасць падзей, зрабіць адпаведныя вывады.

Фарміраванне ўменняў вучэбнай дзейнасці ў навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю патрабуе апоры на дыягнастычныя дадзеныя. Гэта дазваляе ўстанавіць не толькі ступень сфарміраванасці канкрэтных уменняў, але і іх іерархію, сукупнасць умоў фарміравання. У гэтым выпадку становіцца магчымым вызначэнне зместу і методыкі выкарыстання заданняў на аснове канкрэтных паказчыкаў. Менавіта яны сведчаць пра эфектыўнасць дзейнасці настаўніка.

Як бачна, карэкцыйная накіраванасць навучання можа быць больш паспяхова рэалізавана шляхам стварэння аптымальных умоў для развіцця ўменняў вучэбнай дзейнасці ў навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю сродкамі літаратурнага тэксту: адаптацыі метадычных прыёмаў работы з улікам выяўленых цяжкасцей; актыўнага выкарыстання разнастайных прыёмаў займальнасці; вызначэння паслядоўнасці работы і выкарыстання індывідуальна выяўленых прыёмаў навучання (лінейнага выбудоўвання сэнсавых сувязей, канкрэтызацыі маўлення, алгарытмізацыі дзейнасці, мадэліравання кампазіцыйнай структуры тэксту і інш.); варыятыўнасці паўтарэння і замацавання; вылучэння сістэмы заданняў, якія прымяняюцца як узаемазвязаныя на карэкцыйных і навучальных занятках для фарміравання ўменняў работы з тэкстам і інш.

Варта адзначыць, што дасягненне найбольш аптымальнага выніку карэкцыйна-развіццёвай работы пры арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўмовах інтэграванага навучання і выхавання магчыма толькі ў тым выпадку, калі існуе цеснае ўзаемадзеянне спецыялістаў, якія суправаджаюць дзіця, і яго бацькоў.

## Спіс літаратуры

1. Ильина, С. Ю. Личностно ориентированные и нетрадиционные технологии в обучении русскому языку школьников с интеллектуальной недостаточностью / С. Ю. Ильина, А. С. Чижова. – СПб. : КАРО, 2013. – 96 с.

2. Методика формирования умений учебной деятельности у учащихся с легкой интеллектуальной недостаточностью : пособие / В. А. Шинкаренко [и др.] ; под ред. В. А. Шинкаренко. – Минск : Четыре четверти, 2015. – 76 с.

3. Содержание и методика развития познавательной деятельности младших школьников с легкой интеллектуальной недостаточностью : учеб.-метод. пособие / В. В. Гладкая [и др.]. – Минск : БГПУ, 2010. – 80 с.

4. Свиридович, И. А. Читательская компетенция учащихся с интеллектуальной недостаточностью : приемы формирования / И. А. Свиридович // Народная Асвета. – 2021. – № 6. – С. 34–37.